УДК 008(476):008(410)

**А. Д. Дудзько**

Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Ажэшкі, 22, 230023 Гродна, Рэспубліка Беларусь, +375 (152) 73 19 00, anastakareva@yandex.ru

## ГЕНЕЗІС І СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА Ў ВЯЛІКАБРЫТАНІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XX — ПАЧАТАК XXI СТАГОДДЗЯ)

Артыкул прысвечаны аналізу гістарыяграфічнай традыцыі і крыніц па гісторыі станаўлення замежнага беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя, характарыстыцы яго асноўных этапаў. На падставе дадзеных крыніц робяцца высновы пра недастатковую ступень вывучанасці дадзенай праблематыкі, шырокі роскід ацэнкавых пазіцый аўтараў. Крыніцавае поле даследавання дазваляе рэканструяваць праблему больш поўна і стварыць цэласную карціну вывучанай з'явы. Вылучаюцца два асноўныя этапы фарміравання беларускай дыяспары і беларусазнаўства ў акрэслены перыяд: 50-я — 80-я гады XX стагоддзя і 90-я гады XX — пачатак XXI стагоддзя. Даецца характарыстыка асноўных кірункаў культурна-асветніцкай і навуковай дзейнасці беларускіх арганізацый у Вялікабрытаніі (філалагічнае, літаратуразнаўчае, гістарычнае), адзначаецца іх уплыў на станаўленне акадэмічнага і ўніверсітэцкага беларусазнаўства ў гэтай краіне.

**Ключавыя словы:** замежнае беларусазнаўства; гістарыяграфія і крыніцы праблемы; беларуская дыяспара Вялікабрытаніі; універсітэцкія і акадэмічныя цэнтры; брытанскія славісты.

Бібліягр.: 22 назвы.

**A. D. Dudko**

Grodno Yanka Kupala State University', Ministry of Education of the Republic of Belarus, 22, Ozheshko str., 230023 Grodno, Republic of Belarus, +375 (152) 73 19 00, anastakareva@yandex.ru

## THE GENESIS AND FORMATION OF BELARUSIAN STUDIES IN GREAT BRITAIN (THE SECOND HALF OF THE XX$^{th}$ — THE BEGINNING OF THE XXI$^{th}$ CENTURY)

This article deals with the analysis of historiographic tradition and sources relating to the history of Belarusian diasporas and the formation of Belarusian studies in Great Britain at the end of the XX$^{th}$ century — the beginning of the XXI$^{th}$ century. The study of the published sources allows to conclude about the insufficient knowledge of the problem We set and achieve the goals, thus, it helps create a holistic view on the phenomenon. The main steps in the formation of Belarusian studies in Great Britain in the above mentioned period are 1) the 50s — the 80s of XX$^{th}$ century, influenced by the World War II and the Belarusian diasporas settled in Britain after it; 2) the 90s of the XX$^{th}$ — the beginning of the XXI$^{th}$ century, characterized by the growing influence of Belarusian diasporas and an interest among academicians and cultural communities in Belarusian problems and the formation of a separate direction in Belarusian studies, focused on the history and culture of East European ethnicities of the CIS states.

© Дудзько А. Д., 2015



Репозиторий БарГУ

**Key words:** Belarusian studies; historiography and sources; Belarusian diasporas in Great Britain; scientific and cultural centers; leading British slavists.
Ref.: 22 titles.

**Уводзіны.** У сучасных умовах набыцця Рэспублікай Беларусь рэальнага суверэнітэту, ва ўмовах глабалізацыі міжнародных сувязей вялікае значэнне мае інфармацыя аб «вобразе» маладой еўрапейскай незалежнай дзяржавы ў грамадскай свядомасці міжнароднай супольнасці, асабліва тых дзяржаў, якія звязаны з сённяшняй Беларуссю цеснымі эканамічнымі, палітычнымі і культурнымі стасункамі. Да іх ліку, бясспрэчна, адносіцца і Вялікабрытанія. «Вобраз» Беларусі фарміруецца ў сферы ўрадавай палітыкі, у культурным, медыйным кантэкстах гэтай дзяржавы ў асноўным на базе аналітычных ацэнак экспертнай супольнасці (перш за ўсё, даследчыкаў-славістаў і тых уплывовых асоб беларускай дыяспары, якія прадстаўляюць Беларусь у Вялікабрытаніі).

Таму вывучэнне праблемы фарміравання беларускай дыяспары і беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў сацыяльна-культурным кантэксце беларуска-брытанскіх культурных сувязей другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя з’яўляецца актуальным і дазваляе выявіць прычыны, умовы і механізмы стварэння сістэмы гісторыка-культуралагічных ведаў пра Беларусь у брытанскім краіназнаўчым «ландшафце». Гэта дае магчымасць атрымаць карысную інфармацыю для фарміравання навукова абгрунтаванай культурнай палітыкі, якую праводзяць Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі адносна краін-партнёраў нашай дзяржавы ў сусветным палітычным і культурным супольніцтве з канца XX стагоддзя. Акрамя таго, навуковая актуальнасць дадзенай праблемы абумоўлена і слабай яе распрацоўкай у беларускай і англійскай гістарыяграфіі і культуралогіі другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя.

Мэта нашага даследавання ў дадзеным напрамку — выяўленне спецыфікі працэсу генезісу і станаўлення беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў 50-я гады XX — пачатку XXI стагоддзя, які разглядаецца на фоне сацыякультурнага і палітычнага кантэкстаў узаемаадносін Беларусі з Аб’яднаным Каралеўствам і развіцця брытанскай славістыкі гэтага перыяду.

Для дасягнення пастаўленай мэты ў якасці прыярытэтных вылучаюцца наступныя задачы, без якіх немагчыма сістэмна-аналітычнае ўяўленне дадзенага феномену: раскрыццё характэрных асаблівасцяў і ступені распрацаванасці гэтай праблемы ў папярэдняй гістарыяграфічнай традыцыі і крыніцавым полі другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя; выяўленне прычын (палітычнага, сацыякультурнага і навуковага характару), якія вызначылі асаблівасці генезісу і станаўлення беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў 50-я гады XX — пачатку XXI стагоддзя; вызначэнне спецыфікі асноўных этапаў і форм вывучэння Беларусі і яе культуры ў навуковай славістычнай традыцыі і даследніцкай практыцы прадстаўнікоў беларускай дыяспары Вялікабрытаніі (50-я гады XX — пачатак XXI стагоддзя); вызначэнне асноўных кірункаў і дамінантнай праблематыкі беларусазнаўчых даследаванняў у Вялікабрытаніі ў гэтыя гады як на інстытуцыйным узроўні (універсітэцкія і акадэмічныя навуковыя цэнтры Вялікабрытаніі; культурна-асветніцкія і навуковыя цэнтры беларускай дыяспары), так і на персанальным (працы вядучых славістаў гэтай краіны, прысвечаныя Беларусі і яе культуры).

У нашым артыкуле ўяўляецца мэтазгодным на дадзеным этапе вывучэння гэтага пытання сканцэнтраваць асноўную ўвагу на трох аспектах даследуемай праблемы: 1) ступені яе вывучанасці ў гістарыяграфічнай традыцыі; 2) рэпрэзентацыі дадзенай праблемы ў інфармацыйным полі крыніц; 3) вылучэнні

Репозиторий БарГУ

і характарыстыцы асноўных этапаў станаўлення беларускай дыяспары і беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў рамках вызначанага гістарычнага перыяду.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічнай асновай з'яўляецца комплексны міждысцыплінарны падыход, які ўключае прынцыпы ўзаемасувязі сацыягуманітарных і гістарычных навук. Праца будуецца на трох прынцыпах навуковага даследавання: гістарызму, які дазваляе разгледзець працэс станаўлення беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў ходзе яго эвалюцыйнага развіцця ў цеснай узаемасувязі з сацыяльна-палітычным і сацыякультурным кантэкстам савецка-брытанскіх і беларуска-брытанскіх стасункаў пасляваеннага перыяду; сістэмнасці (аналіз функцыянальнага і гістарычнага аспектаў развіцця замежнага беларусазнаўства ў навейшы час гісторыі, што дазваляе вызначыць ролю беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў шырокім беларусазнаўчым кантэксце пасляваеннай Еўропы; аб'ектыўнасці (крытычны аналіз фактаграфічных дадзеных айчынных і замежных крыніц, супастаўленне аргументаў і пазіцый аўтараў). Усе пералічаныя метады выкарыстаны з мэтай даць больш збалансаваную характарыстыку прадмета нашага вывучэння.

**Асноўная частка.** Праблемы гісторыі станаўлення беларускай дыяспары і фарміравання беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі разглядаюцца ў айчыннай і замежнай даследчыцкай традыцыях вельмі нераўнамерна і фрагментарна. Можна вылучыць невялікую колькасць прац, спалучаных з гэтай тэматыкай. Галоўным чынам, яны аналізуюць сацыяльна-палітычны і культурны кантэкст міжнародных культурных і навуковых сувязяў Беларусі з краінамі Заходняй Еўропы ў канцы 80-х гадоў XX — пачатку XXI стагоддзя (даследаванні Л. Уласавай, Н. Верабей, А. Галубовіча, А. Ягорава, Л. Каралёнак, Д. Крывашэя, А. Ляднёвай, А. Разанава, Г. Сяргеевай, В. Шадурскага, У. Снапкоўскага і інш.). Прац, спецыяльна прысвечаных дадзенай праблеме, за выключэннем артыкулаў А. Ляднёвай, Г. Сяргеевай, А. Гардзіенкі і кандыдацкай дысертацыі Л. Каралёнак, практычна няма. Найбольш істотны ўклад у вывучэнне беларускай дыяспары ў Вялікабрытаніі зрабіла грунтоўная манаграфія Н. Гардзіенка [1, с. 26—30].

Ажыўленне цікавасці да дадзенай праблематыкі ў беларускай гістарыяграфіі і гісторыка-культуралагічнай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў уяўляецца невыпадковым. Менавіта з пачатку 1990-х гадоў, калі Беларусь абвясціла аб сваім суверэнітэце, пачалі з'яўляцца першыя аглядныя публікацыі айчынных даследчыкаў, у якіх з новых пазіцый, з улікам агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, стала пераасэнсоўвацца гісторыя беларускай дыяспары. Адной з першых публікацый стала кніга Б. Сачанкі «Беларуская эміграцыя», дзе давалася сістэматызаваная інфармацыя па гісторыі беларускай эміграцыі за мяжой [2]. Далейшая распрацоўка гэтай тэматыкі знайшла адлюстраванне ў асобных раздзелах шэрагу даследаванняў беларускага мінулага, у навукова-папулярных артыкулах, дзе гісторыя беларускай эміграцыі з'яўлялася адным са значных сюжэтаў больш шырокага тэматычнага поля. Агульныя агляды гісторыі беларускай дыяспары як важнай з'явы ў гісторыі беларускага народа і яго культуры былі апублікаваны Г. Сяргеевай [3] і іншымі даследчыкамі.

У апошняе дваццацігоддзе XX стагоддзя актыўна асэнсоўвалася гісторыка-культурная, асветніцкая і навуковая спадчына беларускага замежжа, якая доўгі час была невядомай для шырокага кола чытачоў савецкага перыяду (працы А. Каўкі, Л. Языковіч, А. Гардзіенкі) [4]. У гэтых работах увагу даследчыкаў прыцягвалі пытанні аб ролі беларускай эміграцыі ў захаванні і развіцці ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння; фактараў фарміравання беларускай нацыянальнай ідэалогіі; ролі хрысціянскіх канфесій у рэлігійным і грамадска-культурным жыцці беларусаў замежжа. Першыя грунтоўныя напрацоўкі беларускіх аўтараў у гэтым кірунку былі апублікаваны ў трох выпусках зборнікаў «Культура беларусаў



Рэпазіторый БарДУ

скага замежжа». Там акрэсліваліся асноўныя праблемы вывучэння культуры беларускага замежжа; роля цэнтраў навуковага і культурнага жыцця беларускай супольнасці ў Вялікабрытаніі; пытанні станаўлення беларускай нацыянальнай школы ў Аб'яднаным Каралеўстве; праблемы грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці беларускіх арганізацый Вялікабрытаніі, іх стасункі з уладамі і насельніцтвам (працы А. Сабалеўскага, А. Мальдзіса, А. Ляднёвай, Г. Сяргеевай, Г. Марцуля) [5]. З апошніх прац айчынных беларускіх даследчыкаў, якія разглядалі праблемы беларускай пасляваеннай эміграцыі, вылучаецца кніга «Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў», падрыхтаваная А. Адзінцом [6]. Адзін з раздзелаў гэтага выдання прысвячаецца характарыстыцы прадстаўнікоў беларускай дыяспары Вялікабрытаніі. У кнізе сабраны артыкулы і ўспаміны, напісаныя актыўнымі ўдзельнікамі беларускага грамадска-культурнага і палітычнага жыцця гэтай краіны.

На мяжы XX — XXI стагоддзяў праблемы, звязаныя з гісторыяй фарміравання беларускай замежнай дыяспары і беларусазнаўства ў пасляваенным свеце, увайшлі ў кола выданняў энцыклапедычнага характару (шматтомныя «Беларуская энцыклапедыя», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету» і інш.), дзе друкуюцца артыкулы, якія раскрываюць само паняцце «дыяспара», вызначаюцца найбольш значныя падзеі ў жыцці беларусаў замежжа, роля і дзейнасць беларускіх грамадска-культурных і палітычных арганізацый і найбольш значных прадстаўнікоў беларускай замежнай супольнасці. З выданняў гэтага тыпу асаблівай ўвагі заслугоўвае надрукаваны ў 2000 годзе пры падтрымцы грамадскага аб'яднання «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў» энцыклапедычны даведнік «Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету». У ім былі змешчаны артыкулы, якія раскрывалі такія значныя тэмы, як беларуская эміграцыя і дыяспара (Г. Сяргеева), беларускія і замежныя арганізацыі па міжнароднаму культурнаму супрацоўніцтву (А. Ваніцкі, В. Мацкевіч, А. Белавусава, Г. Сурмач), знакавыя падзеі беларускай культуры і навукі канца XX стагоддзя у жыцці беларусаў свету (Г. Сурмач) [7].

У значна меншай ступені распаўсюджвалася інфармацыя пра беларускую прысутнасць у свеце ў энцыклапедычных выданнях Вялікабрытаніі таго часу. Можна адзначыць, што ў гістарыяграфічную традыцыю праблемы фарміравання беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі пасляваеннага перыяду значны ўклад унеслі і прадстаўнікі замежнай навукі і культуры, цесна звязаныя з дзейнасцю беларускай дыяспары гэтай краіны. Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі там з'явілася шмат публікацый у навуковай перыёдыцы, прысвечаных жыццю і творчай спадчыне вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў, майстроў культуры і вучоных-беларусаў Вялікабрытаніі. З іх ліку вылучаецца кніга айца А. Надсана «Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус» [8], у якой дэталёва даследуецца жыццёвы шлях першага беларускага грэка-каталіцкага біскупа Ч. Сіповіча, чыя дзейнасць разглядаецца ў кантэксце рэлігійна-культурных і палітычных падзей навейшага часу, асабліва тых, якія непасрэдна адлюстраваліся ў гісторыі беларускага народа. Праца гэта была створана як на падставе асабістых успамінаў аўтара, так і багатых, раней невядомых архіўных крыніц. Нельга не адзначыць, што беларуская замежная гістарыяграфія Вялікабрытаніі апошняга дваццацігоддзя грунтуецца на значна больш шырокім і глыбокім, хоць і крытычным, выкарыстанні беларускіх выданняў савецкага і постсавецкага перыядаў, асэнсаванні прац беларускіх даследчыкаў у галіне мовазнаўства, этналогіі, археалогіі і гісторыі Беларусі. Але і сёння ў некаторых публікацыях адчуваецца недастатковасць дакументальнай базы і адгалоскі прапагандысцкага характару, палітычнай прадузятасці — уплыў стэрэатыпаў эпохі «халоднай вайны». Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі выклікала рост колькасці даследчыкаў Беларусі і яе культуры ў Вялікабрытаніі. На гэтыя гады прыпадае відавочная актыўнасць

Рэпазіторый БарГУ

англійскіх навукоўцаў-славістаў у галіне беларусазнаўства, значна пашыраецца навуковае ўзаемадзеянне паміж даследчыкамі з Беларусі і вучонымі-гуманітарыямі Аб'яднанага Каралеўства (Дж. Дынглі, П. Мэйо, Г. Пікарда, А. Макмілін, Дж. Кліер, А. Ціханавецкі, а. А. Надсан, І. Агінскі, М. Гедройц, Ю. Весялкоўскі і інш.).

На сёння магчыма адзначыць пазітыўную дынаміку ў асэнсаванні і вывучэнні ролі беларускай дыяспары Вялікабрытаніі і асаблівасцяў фарміравання традыцый беларусазнаўства гэтай краіны як у беларускай гістарыяграфіі, так і ў англійскай славістыцы. Высновы і назіранні па шматлікіх пытаннях праблемы станаўлення беларусазнаўства ў пасляваеннай Вялікабрытаніі ўжо ў значнай колькасці змешчаны ў зборніках навуковых артыкулаў, матэрыялах міжнародных канферэнцый у айчынным і замежным грамадска-палітычным і навуковым друку.

На сучасны момант у беларускай гістарыяграфічнай і гісторыка-культуралагічнай традыцыі адсутнічаюць манаграфічныя сістэмныя даследаванні, прысвечаныя дадзенай праблеме. Наяўная даследніцкая традыцыя, як у Брытаніі, так і ў Беларусі, адносіцца, галоўным чынам, да пытанняў гісторыі фарміравання беларускай дыяспары на Брытанскіх выспах і гісторыі англа-беларускіх сацыяльна-эканамічных, палітычных, культурных сувязяў ХХ стагоддзя. У 90-я гады ХХ — пачатку ХХІ стагоддзя была ўведзена ў зварот значная колькасць крыніц як нарратыўнага, так і дакументальнага характару. Аднак праблемы гісторыі брытанскай славістыкі ў цэлым і беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў прыватнасці знаходзяцца выяўна на перыферыі даследніцкай увагі навукоўцаў-гуманітарыяў Беларусі. І ў брытанскай славістыцы, і ў гістарычнай культуралогіі Беларусі адсутнічае манаграфічная сістэмная распрацоўка станаўлення традыцый беларусазнаўства ў Аб'яднаным Каралеўстве. Таму яе даследаванне дазволіць не толькі папоўніць гэты прабел у нашых уяўленнях аб стане замежнага беларусазнаўства ў свеце, але і істотна пашырыць асабістыя веды аб фактарах фарміравання «вобразу Беларусі» і яе культуры ў брытанскай славістычнай супольнасці. Апора на гэтыя пэўныя сістэмныя веды дазваляе выпрацаваць рэалістычную прагнозную мадэль культурнай палітыкі нашай дзяржавы, што праводзіцца на Брытанскіх выспах.

Вывучэнне бібліяграфічных крыніц, гістарыяграфіі праблемы, праца з электроннымі рэсурсамі Інтэрнэта сведчаць, што даследаванне адзначанай у нашым артыкуле праблемы можа абапірацца на дастаткова прадстаўнічую і разнастайную крыніцазнаўчую базу (крыніц як апублікаваных, так і архіўных). Вывучэнне іх дазваляе рэканструяваць феномен фарміравання беларускай дыяспары і беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі канца 40-х — 90-х гадоў ХХ стагоддзя наступным чынам.

Крынічавая база даследавання адзначаецца відавой разнастайнасцю. Яна прэзентавана не толькі беларускімі, але і англійскімі крыніцамі (як надрукаванымі, так і архіўнымі). Найбольш прадстаўнічымі групавымі комплексамі крыніц, якія дазваляюць рэканструяваць феномен, з'яўляюцца: 1) перыядычны друк (грамадска-палітычны і навуковы); 2) успаміны; 3) публіцыстыка; 4) літаратура энцыклапедычна-даведачнага характару; 5) навуковыя працы замежных беларусазнаўцаў Вялікабрытаніі (гісторыкаў, філолагаў, этнолагаў, мастацтвазнаўцаў), прысвечаныя даследаванню праблем беларускай гісторыі і культуры; 6) архіўныя комплексы і рукапісныя зборы Рэспублікі Беларусь і Вялікабрытаніі, якія адлюстроўваюць культурна-асветніцкую і даследчую дзейнасць навуковых цэнтраў гэтых краін у галіне беларусазнаўства і беларуска-брытанскіх культурных і навуковых сувязяў; 7) электронныя рэсурсы Інтэрнэт [9, с. 11—22].

Вялікабрытанія з'яўляецца адносна новым месцам пасялення беларускай эміграцыі. На працягу 1946—1951 гадоў тут з'явіліся першыя арганізацыі беларускіх эмігрантаў. Цэнтр беларускай дыяспары Вялікабрытаніі — Лондан, дзе функцыянуюць Англа-беларускае таварыства, Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі, беларуская бібліятэка-музей імя Ф. Скарыны, якія ладзяць навуковую, выда-



Рэпазіторый БарДУ

вецкую, культурную дзейнасць беларускай эміграцыі, дзе працуюць клубы, архівы, школы, цэрквы і касцёлы. Паводле звестак энцыклапедыі гісторыі Беларусі, у Вялікабрытаніі пражывае каля 20 тысяч беларусаў, але айцец А. Надсан адзначаў, што гэта колькасць значна меншая — 5 тысяч чалавек [10, с. 7].

У большасці сваёй беларусы, якія пераехалі ў пасляваенныя гады ў Англію, — палітычныя эмігранты, што не ўспрымалі савецкі камуністычны рэжым, і калабарацыяністы, якія баяліся праследаванняў з боку савецкай улады. Шмат засталося ў Вялікабрытаніі былых жаўнераў польскай арміі, якія ў 1939—1942 гадах знаходзіліся ў савецкіх турмах. Асаблівасцю пасляваеннай эміграцыі ў Вялікабрытаніі стала змена яе сацыяльнага статусу: павялічылася колькасць інтэлігенцыі, якая станоўча паўплывала на сацыяльна-палітычныя, культурныя працэсы ў месцах іх згуртавання, а іх дзейнасць спрыяла захаванню і перадачы нашчадкам традыцый свайго народа, мовы, культуры, гісторыі, абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці, а таксама знаёмству заходняга свету з нашай культурай. Аднак працэс фарміравання беларускай дыяспары ў Вялікабрытаніі ішоў складана: супярэчлівымі былі ўзаемаадносіны паміж разнастайнымі плынямі, грамадскімі групоўкамі, у прыватнасці, прыхільнікамі Беларускай Цэнтральнай Рады і Беларускай Народнай Рэспублікі, чые рознагалоссі па палітычных матывах неслі за сабой і раскол па рэлігійным пытанні.

Беларускія эмігранты былі неаднародныя па рэлігійнай прыналежнасці. Царква адыгрывала кансалідуючую ролю, спрыяла падтрыманню кантактаў паміж суайчыннікамі. Пры цэрквах вялася шырокая культурна-асветніцкая дзейнасць (адкрываліся бібліятэкі, школы, творчыя аб'яднанні, разгортваўся перыядычны друк — газеты, часопісы, бюлетэні).

У заходнееўрапейскіх краінах, у прыватнасці Вялікабрытаніі, пасля Другой сусветнай вайны асела вялікая колькасць беларусаў-католікаў, якія арганізавалі сваю дзейнасць пры падтрымцы Ватыкана. У каталіцкіх універсітэтах Еўропы беларускія студэнты маглі атрымаць адукацыю. Найбольш яскравым прыкладам служыць універсітэт у Лювэне (Бельгія). У шэрагу заходнееўрапейскіх краін, дзе знаходзіліся беларускія каталіцкія святары, ствараліся беларускія каталіцкія місіі. Кіраўніком Беларускай каталіцкай місіі ў Англіі быў прызначаны айцец Чэслаў Сіповіч. З дапамогай «Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі» (далей — ЗБВБ), ахвяраванняў звычайных прыхаджан і пры фінансавай падтрымцы Ватыкана ў Лондане быў заснаваны беларускі дом, названы Марыянскім, у якім існавала Беларуская царква св. Пятра і Паўла грэка-каталіцкай канфесіі (закладзена ў 1947 годзе айцом А. Надсанам). У 1961 годзе побач з Марыянскім домам была адкрыта школа імя св. Кірылы Тураўскага, у якой вучылі хлопчыкаў незалежна ад іх веравызнання. У 1971 годзе пры Марыянскім доме была створана бібліятэка імя Ф. Скарыны, якая затым стала бібліятэкай-музеем, значным культурна-асветніцкім цэнтрам беларусаў Вялікабрытаніі. Вялікі ўклад у яе стварэнне і развіццё ўнеслі Я. Германовіч, Л. Гарошка, Ч. Сіповіч, А. Надсан [11, с. 26—30].

Трэба зазначыць, што ў пасляваеннае дзесяцігоддзе сярод прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў Вялікабрытаніі назіралася рэлігійная актыўнасць, якая садзейнічала абуджэнню нацыянальнай свядомасці беларусаў. Аднак з канца 70-х — пачатку 80-х гадоў назіраецца спад рэлігійнай і грамадскай актыўнасці, што было выклікана далейшай асіміляцыяй беларусаў з брытанцамі, з'яўленнем пакалення беларусаў з нізкім узроўнем беларускай нацыянальнай свядомасці.

Адным з асноўных напрамкаў дзейнасці рэлігійна-асветніцкіх беларускіх арганізацый было стварэнне сістэмы адукацыі сярод беларускіх эмігрантаў на Брытанскіх выспах. Першыя школы такога тыпу пачалі ўзнікаць у 50-х гадах XX стагоддзя.

З пашырэннем дзейнасці розных беларускіх грамадска-палітычных, культурна-асветніцкіх і рэлігійных аб'яднанняў у Вялікабрытаніі разгортваецца друк перыядычных і неперыядычных выданняў [12, с. 10].



Рэпазіторый БарГУ

У Вялікабрытаніі, асабліва ў пасляваенныя гады, выпускалася шмат рэлігійнай літаратуры, у якой асвятляліся разнастайныя бакі нацыянальнага жыцця. На старонках дадзеных выданняў змяшчаліся звесткі не толькі аб рэлігійным жыцці беларускай эміграцыі, але і інфармацыя аб культурна-асветніцкіх, грамадскіх падзеях беларускай дыяспары, матэрыялы гістарычнага характару. Даследаванні рэлігійнага друку эміграцыі дазваляюць зрабіць вынікі аб аднолькавасці праблем і пытанняў, якія адлюстроўваюцца ў беларускіх рэлігійных выданнях замежжа, нягледзячы на іх розную канфесійную накіраванасць. Яны адлюстроўваюць жыццё беларускай дыяспары ў пасляваенны час, што дае падставы лічыць іх важнай крыніцай па гісторыі не толькі беларускай дыяспары, а ўвогуле па гісторыі Беларусі.

Значным беларусазнаўчым перыядычным выданнем з’яўляўся штогоднік «Часопіс беларускіх даследаванняў» (“The Journal of Belarusian Studies”), які выдаваўся Англа-беларускім таварыствам з 1965 па 1988 год. У ім друкаваліся грунтоўныя артыкулы аб дарэвалюцыйнай Беларусі, матэрыялы, прысвечаныя тэматыцы культурнай спадчыны Беларусі, змяшчаліся рэцэнзіі на выдадзеныя ў нашай краіне кнігі, выбраная бібліяграфія апошніх выданняў. Свае матэрыялы змяшчалі ў штогодніку не толькі беларускія эмігранты, але і навукоўцы з Англіі і іншых краін. Працягам спыненага выдання з’яўлялася серыя «Неперыядычныя вучоныя запіскі беларускіх даследаванняў», першы нумар якой выйшаў у Лондане ў 1995 годзе. Складальнікамі і рэдактарамі «Запісак...» з’яўляліся прафесар Лонданскага ўніверсітэта, даследчык рускай і беларускай літаратуры Арнольд Макмілін і выкладчык гісторыі ў тым жа ўніверсітэце Дж. Дынглі. У гэтым выданні змешчаны артыкулы і рэцэнзіі па пытаннях беларускай мовы, літаратуры і гісторыі, разглядаюцца праблемы грамадскага, культурнага і навуковага характару ў розныя перыяды гісторыі Беларусі. Спонсарам часопіса было Англа-беларускае таварыства на чале з яго старшынёй Дж. Дынглі і беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны на чале з а. А. Надсанам. Усяго былі надрукаваны два тамы «Запісак...» [13, с. 13].

Беларуская дыяспара ў Вялікабрытаніі стварыла шэраг навукова-культурных цэнтраў, дзейнасць якіх накіравана на захаванне беларускіх традыцый, мовы, рэлігіі, а таксама на знаёмства брытанцаў з багатай культурай нашай Радзімы. Кіраўнікамі гэтых устаноў былі прадстаўнікі інтэлігенцыі беларускага замежжа (палітычныя, рэлігійныя, культурныя дзеячы). У дзейнасці Англа-беларускага таварыства прымалі актыўны ўдзел такія значныя фігуры, як лорд Харлеч, Чэслаў Сіповіч, прафесар Роберт Оці, лэдзі Фрэнсіс Фіппс, Аберон Герберт, Павел Асіповіч, Павел Навара, Ян Міхалюк і інш. [14].

У 1971 годзе ў Лондане з’яўляецца яшчэ адзін навукова-культурны цэнтр — беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны, які сваёй дзейнасцю заахвочвае далейшыя даследаванні ў галіне беларусазнаўства і публікацыю іх вынікаў. Заснавальнікам яе быў айцец Чэслаў Сіповіч, а з 1981 года кіраўніком стаў айцец Аляксандр Надсан. Бібліятэка і музей аб’ядноўваюць беларускіх эмігрантаў і англійскіх беларусістаў (у асноўным прадстаўнікоў факультэта славістыкі Лонданскага ўніверсітэта). Пачатак калекцыі і архіва бібліятэкі паклаў біскуп Ч. Сіповіч. На сёння ў ёй знаходзіцца вялікая колькасць кніг, рукапісаў, дакументаў, артэфактаў беларускай культуры. Беларуская бібліятэка-музей стала месцам правядзення шматлікіх навукова-культурных мерапрыемстваў (лекцый, канферэнцый, сустрэч з гасцямі з Беларусі). З цягам часу Лонданскі цэнтр пачаў выконваць ролю прадстаўніка беларускай навукі і культуры за мяжой [15].

Вялікі ўклад у даследаванне і папулярызацыю беларускай культуры сярод брытанцаў і нашых суайчыннікаў зрабіў прафесар Лонданскага ўніверсітэта, славіст, спецыяліст па рускай і беларускай літаратурах Арнольд Макмілін. Ён з’яўляецца аўтарам многіх цікавых водгукаў, рэцэнзій, артыкулаў і манаграфій. Самымі значнымі сталі яго манаграфічныя даследаванні «Гісторыя беларускай літаратуры

Рэпазіторый БарДУ

ад яе вытокаў да сённяшніх дзён» (1977), «Беларуская літаратура ў 50—60-я гады XX стагоддзя» (1999), «Беларуская літаратура дыяспары» (2002). Кніга Арнольда Макміліна «Беларуская літаратура ў 50—60-я гады XX стагоддзя» — гэта грунтоўная энцыклапедыя гісторыі нашай паэзіі, прозы і драматургіі, якая абмяжоўваецца акрэсленым у назве перыядам. Па сутнасці, гэта была першая кніга па гісторыі беларускай літаратуры, выдадзеная ў Заходняй Еўропе. Сёння працы А. Макміліна, якога ў 70-я гады савецкія навукоўцы абвінавачвалі ў суб'ектыўнасці, з'яўляюцца каштоўнымі літаратуразнаўчымі крыніцамі, вызначаюцца высокай даследчыцкай культурай, а суб'ектывізм, на думку многіх сучасных літаратурных крытыкаў, бачыцца дасягненнем, сведчаннем незалежнага погляду замежнага вучонага на беларускую культуру. Дзякуючы яго даследаванням і артыкулам, беларуская літаратура стала вядомай не толькі ў Вялікабрытаніі, але і ў іншых краінах свету.

Вывучэннем эмігранцкай літаратуры (пераважна паэзіі), перакладамі твораў беларускіх класікаў на англійскую мову актыўна займалася Вера Рыч. Даследаванні беларускай мовы ў 1970-я гады праводзіў прафесар П. Дж. Мэйо («Граматыка беларускай мовы», Шэфілд, 1976). Яскравай фігурай сярод англійскіх даследчыкаў-беларусістаў быў Гай Пікарда, цэнтрам увагі якога стала беларуская царкоўная музыка. У 80-я гады XX стагоддзя праблемамі вывучэння і папулярызацыі гісторыі беларускай культуры займаліся выкладчыкі Школы славянскіх даследаванняў Лонданскага ўніверсітэта Дж. Дынглі і Дж. Кліер. У цэнтры іх увагі знаходзіліся пытанні этнакультурнага развіцця Беларусі [16, с. 106—113].

Такім чынам, мы бачым, што ў перыяд з канца 40-х да 80-х гадоў XX стагоддзя ствараецца нацыянальна свядомае ядро беларускай эміграцыі, якое закладвае фундамент культурна-асветніцкай дзейнасці ў Вялікабрытаніі па азнаямленню англійскай грамадскасці з культурнай спадчынай Беларусі, спрыяе станаўленню вядучых нацыянальных і грамадска-культурных цэнтраў, транслятараў беларускай культуры на Брытанскіх выспах. Беларуская эміграцыя гэтага часу адзначаецца высокай актыўнасцю і шырокім размахам сваёй культурнай дзейнасці: мастацкая літаратура, літаратуразнаўства, часопісы, газеты, музеі, бібліятэкі, музыка, школы, шырокі спектр рэлігійнага жыцця, што дазваляе зрабіць выснову аб інстытуцыянальнай афармленасці беларускай дыяспары ў канцы 80-х гадоў XX стагоддзя. Яна выступае як галоўны «правакуючы фактар», які выклікаў цікавасць да Беларусі і яе культуры ў гэтыя гады ў асяроддзі акадэмічнай і ўніверсітэцкай эліты, славістаў Вялікабрытаніі. Пад яе ўплывам сфарміравалася першая група брытанскіх славістаў, якія спецыяльна пачалі займацца праблемамі беларускай культуры і гісторыі.

У 90-я гады XX — пачатку XXI стагоддзя ў асяроддзі беларускай дыяспары ў Вялікабрытаніі назіраюцца змены. Закрываюцца беларускія клубы ў Брэдфардзе і Манчэстэры, але ў Лондане працягвае існаваць славутая Скарынаўка — бібліятэка-музей. Яна служыла навуковым, выдавецкім і культурным цэнтрам, дзе ладзіліся навуковыя чытанні і лекцыі па беларускай літаратуры і гісторыі, сустрэчы з навукоўцамі, мастакамі, кампазітарамі, пісьменнікамі, грамадскімі дзеячамі з Беларусі, вялася бібліяграфічная дзейнасць.

Сваю працу працягвала адна са старэйшых і найбольш уплывовых беларускіх арганізацый Вялікабрытаніі — «Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі» (ЗБВБ), якая на сёння налічвае каля 50 сяброў [17, с. 32].

Важнейшы кірунак дзейнасці ЗБВБ, Англа-беларускага таварыства і бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лондане — пашырэнне ведаў аб Беларусі ў англамоўным свеце. Такая патрэба ўзмацнілася пасля Чарнобыльскай аварыі. З гэтай мэтай у 1989 годзе у Лондане быў арганізаваны Беларускі камітэт дапамогі ахвярам радыяцыі, у склад якога ўвайшлі сябры ЗБВБ і Англа-беларускага таварыства, у тым ліку беларусіст Дж. Дынглі, былы старшыня ЗБВБ Ян Міхалюк, паэтка і перакладчыца Вера Рыч. Старшынёй камітэта быў абраны айцец Аляксандр Надсан [18, с. 19—20].



Рэпазіторый БарГУ

У 90-я гады XX стагоддзя зменшылася і агульная актыўнасць рэлігійнага жыцця ў Вялікабрытаніі. Асветніцкае жыццё беларусаў Англіі віравала ў асноўным у Лондане вакол Беларускай суботняй школы, бібліятэкі-музея імя Ф. Скарыны. Беларуская школа працавала ў памяшканні Беларускай каталіцкай місіі [19, с. 89].

Выдавецкая справа таксама страчвае сваю актыўнасць. Пасля спынення выдання штогодніка «Часопіс беларускіх даследаванняў» (1965—1988) у 90-х гадах Англа-беларускім таварыствам былі надрукаваны два тамы «Аказійных матэрыялаў» (“Occasional Papers”). З 1997 года пачаў выходзіць штоквартальны часопіс таварыства «Беларуская хроніка» (“Belarusian Chronicle”), які дае панарамны агляд падзей, звязаных з англа-беларускімі дачыненнямі. «Беларуская хроніка» ў 90-я гады XX стагоддзя стала галоўным выданнем для англамоўных беларусістаў. Яна ўключала ўсебаковы агляд культурных, гістарычных, палітычных, спартыўных, кулінарных, дыпламатычных і рэлігійных пытанняў. Выданне месячнага беларускага бюлетэня было важным крокам для Англа-беларускага таварыства ў справе пашырэння дакладнай інфармацыі аб падзеях у Беларусі.

Трэба адзначыць, што дзейнасць беларускай дыяспары і даследчыкаў-беларусазнаўцаў Вялікабрытаніі знаходзіла дастатковую падтрымку з боку навуковых і культурных устаноў самой Беларусі. У нашай дзяржаве ў 90-я гады XX стагоддзя на новым узроўні сталі разглядацца пытанні супрацоўніцтва з дыяспарай. Актыўна працавалі на гэтай глебе Міжнарожная асацыяцыя беларусістаў, Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой («Радзіма»), Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, які ажыццяўляў узаемакантакты Беларусі і замежжа (старшыня А. Мальдзіс) і інш. [20, с. 125]. Свае напрацоўкі ў справе вывучэння дыяспары ў Вялікабрытаніі беларускія даследчыкі данеслі да навуковай супольнасці на шматлікіх міжнародных навуковых канферэнцыях, вынікі якіх былі апублікаваны і распаўсюджаны па свеце праз Міжнародную асацыяцыю беларусістаў. З 1995 годзе пачалося выданне інфармацыйна-аналітычнага і культуралагічнага штомесячнага бюлетэня «Кантакты і дыялогі». На сваіх старонках ён адлюстроўваў важныя з’явы, справы і дзейнасць людзей, якія тварылі і твораць супольную беларускую традыцыю, публікаваў матэрыялы пра грамадска-культурнае ўзаемадзеянне Беларусі з замежнымі краінамі. Такім чынам, рэдакцыя адкрыла сваёй дзейнасцю акно ў свет і паказала свету Беларусь. Сярод беларусістаў з Вялікабрытаніі, якія ўнеслі свой уклад у выданне «Кантактаў і дыялогаў», трэба адзначыць Дж. Дынглі, А. Ціханавецкага, А. Надсана [21, с. 3—6].

Такім чынам, дзейнасць беларускай дыяспары і беларусазнаўства Вялікабрытаніі адзначаюцца ў гэтыя гады няроўнай лініяй развіцця. Калі першая палова 90-х гадоў вызначалася далейшым ўздымам і развіццём назапашанага патэнцыялу, то з канца 90-х гадоў мы бачым адавочнае «затуханне» гэтых працэсаў. І хаця ў Вялікабрытаніі ў дадзены перыяд, як і ў ранейшы час, працавалі грамадска-культурныя і навуковыя цэнтры, беларуская нацыянальная школа, выдавецтвы, наладжваліся выставы, фестывалі, грамадская актыўнасць сярод беларусаў стала значна слабейшай. Варта зазначыць, што ў гэтыя гады моц набірае ўзаемнае пранікненне здабыткаў культуры Вялікабрытаніі і Рэспублікі Беларусь. Гэта абмен кнігамі, часопісамі, газетамі, выданне твораў эмігрантаў на Радзіме, выхад спецыяльных кніг аб дзейнасці эмігрантаў за мяжой, абмен мастацкімі выставамі, сустрэчы на канферэнцыях. Па словах Р. Гарэцкага, усё гэта трэба лічыць пачаткам вялікай справы ўзбагачэння і аб’яднання розных плыняў у адну агульнабеларускую культуру [22, с. 46]. І Вялікабрытанія, і Беларусь сталі больш ведаць адна аб другой. Але нельга не адзначыць перашкоды на гэтым шляху: сёння ўзнікае праблема захавання і развіцця нацыянальнай спадчыны за мяжой у сувязі з адыходам носьбітаў гэтай культуры; адсут-



Рэпазіторый БарДУ

насць свядомай, маладой змены, якая актыўна дзейнічае на карысць беларускай справы; адсутнасць актыўнай культурнай палітыкі Беларусі па стварэнні пазітыўнага «вобразу» нашай краіны ў замежжы, асабліва ў тых краінах, дзе існуе добры падмурак для гэтага — беларуская дыяспара.

**Заключэнне.** Праблема ў дастатковай ступені лакунарна закранута і распрацавана ў айчыннай і замежнай гістарыяграфічнай і гісторыка-культуралагічнай традыцыі другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя. Яе характэрнымі рысамі з’яўляюцца шырокі роскід ацэнкавых пазіцый, якія нярэдка трактуюць адну і тую ж з’яву з дыяметральна процілеглых пунктаў, абумоўленых як палітычнымі поглядамі аўтараў, так і ўзроўнем іх прафесійнай культуры. У той жа час крыніцавае поле даследаванння дазваляе рэканструяваць нашу праблему дастаткова поўна і аргументавана.

У фарміраванні традыцый беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў пасляваеннны час можна вылучыць два асноўныя этапы (50-я — 80-я гады XX стагоддзя і 90-я гады XX — пачатак XXI стагоддзя). На працэс генезісу і станаўлення беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў 50-х — 80-х гадах XX стагоддзя непасрэдны ўплыў мелі сацыяльна-палітычны кантэкст, звязаны з вынікамі Другой сусветнай вайны, і тая роля, якую адыграла ў гэтых падзеях БССР; беларуская дыяспара ў Вялікабрытаніі пасля Другой сусветнай вайны, якая стварыла першыя культурна-асветніцкія і навуковыя цэнтры на яе тэрыторыі; развіццё ў рамках брытанскай славістыкі асобага палітызаванага напрамку — саветалогіі.

Спецыфіка характару развіцця беларусазнаўства як асобнага кірунку ў славістыцы 90-х гадоў XX — пачатку XXI стагоддзя вызначалася: 1) распадам СССР і ўтварэннем новай суверэннай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь; 2) узрастаннем уплыву беларускай дыяспары як часткі экспертнай супольнасці Вялікабрытаніі гэтага часу на рост цікавасці ў акадэмічных універсітэцкіх колах і культурнай прасторы Вялікабрытаніі да беларускай праблематыкі; 3) фарміраваннем асобнага беларусазнаўчага кірунку ў асяроддзі акадэмічнай навуковай супольнасці Вялікабрытаніі, якая пачала спецыялізавацца на вывучэнні культуры і гісторыі ўсходнеславянскіх этнасаў і дзяржаў СНД (універсітэцкія, акадэмічныя, аналітычныя цэнтры пры ўрадавых арганізацыях).

У якасці асноўных кірункаў беларусазнаўчых даследаванняў у Вялікабрытаніі ў гэты час вызначаюцца: філалагічнае, літаратуразнаўчае, гістарычнае. Дамінантная праблематыка перыяду 50-х гадоў XX — пачатку XXI стагоддзя вызначалася распрацоўкай тэм па гісторыі культуры Беларусі XVI — XVII стагоддзяў, канфесійнай гісторыі Беларусі XV — XX стагоддзяў, навейшай гісторыі Беларусі XX — пачатку XXI стагоддзя (з акцэнтаванай увагай да гісторыі войн у лёсе беларускай дзяржаўнасці; асаблівасцям фарміравання беларускай нацыі і яе культуры); гісторыі беларускай літаратуры XX — пачатку XXI стагоддзя.

Трансляцыйны эфект уздзеяння адзнак экспертнай супольнасці Вялікабрытаніі, якая даследавала гісторыю і культуру Беларусі, на фарміраванне вобразу нашай краіны ў СМІ і культурнай палітыцы Аб’яднанага Каралеўства трэба прызнаць на сёння недастатковым. У найбольшай ступені ён вызначыўся ў адзнаках сучаснага дзяржаўнага развіцця Беларусі; у трактоўцы яе адметных палітычных дзеячаў канца XX — пачатку XXI стагоддзя (у прыватнасці, А. Р. Лукашэнкі) і характару сучаснай палітычнай сістэмы краіны.

### Спіс цытаванных крыніц


1. Карава А. Д. Беларусы і беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў 1940-я — 1990-я гг. // Беларус. гіст. часоп. 2009. № 6 (119). С. 26—30.
2. Сачанка Б. І. Беларуская эміграцыя. 2-е выд., дап. і папр. Мінск : Голас Радзімы, 1991. 111 с.
3. Сяргеева Г. Беларуская дыяспара і дзяржаўная палітыка: набыткі і праблемы // Беларус. гіст. часоп. 1993. № 2. С. 72—78.
4. Гардзіенка А. Кароткі нарыс БАПЦ у Вялікабрытаніі // Беларусь і беларусы ў прасторы і часе. Мінск : Лімарыус, 2007. С. 405—413 ; Языковіч Л. Рэлігійнае жыццё беларускай эміграцыі // Беларусіка = Albaruthenica. 1992. С. 280—288.


Рэпазіторый БарДУ

5. Культура беларускага замежжа. Кн. 3 / пад. рэд. А. Сабалеўскага. Мінск : Беларус. навука, 1998. 192 с.

6. Адзінец А. В. Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў : зб. успамінаў. Мінск : Медисонт, 2007. 704 с.

7. Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету / Нац. навук.-асветн. цэнтр імя Ф. Скарыны пры М-ве адукацыі Рэсп. Беларусь, Грамад. аб'яд-не «МАБ». Ч. 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах. 1-е выд. Мінск, 2000.

8. Надсан А. Біскуп Чэслаў Сіповіч. Мінск : Бел-Франс, 2004. 299 с.

9. Карев Д. В., Змитрукевич А. А., Карева А. Д. Восточнославянский мир в зарубежном белорусоведении второй половины XX — начала XXI в.: историографические и источниковедческие аспекты проблемы (Великобритания, ФРГ, США и Канада) // Беларус. археагр. штогоднік. Вып. 10. Мінск, 2009. С. 11—22.

10. Беларуская дыяспара : Нарысы гісторыі і сучасны стан. Мінск : Трыалета, 2006. С. 7.

11. Карава А. Д. Беларусы і беларусазнаўства ў Вялікабрытаніі ў 1940-я — 1990-я гг. С. 26—30.

12. Кіпель З. Беларускі друк на Захадзе // Кантакты і дыялогі. 2002. № 3—4. С. 10.

13. Аксамітаў А. У Англіі думаюць пра Беларусь // Літаратура і мастацтва. 1996. 19 крас. С. 13.

14. The Belarusian Diaspora in the United Kingdom [Electronic resource]. URL: //http://belarusians.co.uk /(date of acceps: 12.05.2015).

15. Грыцкевіч А.: 1) Зборы беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лондане // Кантакты і дыялогі. 1998. № 9. С. 11—13 ; 2) Навукова-культурныя асяродкі беларускай дыяспары і іх роля ў развіцці беларусазнаўства // Кантакты і дыялогі. 2002. № 3—4. С. 3—7.

16. Карева А. Д. История Беларуси в исследованиях славистов Великобритании (вторая половина XX века) // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2010. С. 106—113.

17. Лісоўская Н. Міхалюк Алена // Кантакты і дыялогі. 1999. № 11—12. С. 32.

18. Міцкевіч М., Язневіч М. Беларускі камітэт дапамогі ахвярам радыяцыі і беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны ў Лондане ля вытокаў дабрачыннай дзейнасці ў Беларусі // Кантакты і дыялогі. 2002. № 3—4. С. 19—20.

19. Беларуская дыяспара : Нарысы гісторыі і сучасны стан. С. 89.

20. Марцуль Г. С., Новік Я. Гісторыя Беларусі. Выд. 2-е, дап. Мінск, 1997. С. 125.

21. Здабыткі і праблемы Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў // Кантакты і дыялогі. 2000. № 4—5. С. 3—6.

22. Гарэцкі Р. Культура і адукацыя беларускага замежжа // Культура беларускага замежжа / пад. рэд. А. Сабалеўскага. Мінск, 1998. Кн. 3. С. 46.

Паступіла ў рэдакцыю 22.10.2015

Репозиторий БарГУ